01 М ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі
і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.
№ 10 Нядзеля, 29 Кастрычніка 1944 г.

**Узмацнім тэмпы здачы хлеба ў фонд Чырвонай Арміі! Сустрэнем 27-ю гадавіну кастрычніцкай рэвалюцыі выкананнем усіх абавязкаў перад дзяржавай!**

## БОЛЬШ ХЛЕБА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!

Наша краіна перажывае гістарычныя дні вялікіх перамог над ворагам. У ходзе велічайшых баёў фашысцкая Германія церпіць адно паражэнне за другім. Яна лішылася ўсіх сваіх васалаў. Вайна з кожным днём усё больш і больш пераносіцца ў фашысцкае логава.

Перад совецкім народам, перад яго гераічнай Чырвонай Арміяй стаіць адна з важнейшых задач— дабіць фашысцкага звера ў яго бярлозе. У сувязі з гэтым ад нашага народа патрабуецца яшчэ большае напружанне сіл на дапамогу фронту. Праца кожнага чалавека павінна быць накіравана на разгром ненавіснага ворага.

Працоўныя вызваленых ад нямецкіх акупантаў абласцей і раёнаў аддаюць усе сілы на дапамогу сваёй вызваліцельніцы Чырвонай Арміі. Па закліку калгаснікаў Украіны калгаснікі і аднаасобнікі вызваленай Беларусі ўзялі абавязацельства здаць у фонд Чырвонай Арміі 3 мільёны пудоў хлеба, поўнасцю закончыць усе сельскагаспадарчыя работы,

Сяляне і сялянкі нашага раёна, следуючы пачыну сялян вёскі Вычалкі Брэсцкага раёна, распачалі масавую здачу хлеба ў фонд Чырвонай Арміі. У вёсцы Заполле Белавіцкага сельсовета ужо сабрана звыш двух тон хлеба. Актыўна праходзіць здача хлеба ў фонд Чырвонай Арміі ў Стайкаўскім сельсовеце, у в, Хадоркі Грыўдзенскага сельсовета у гарадскім пасёлку Івацэвічы і др.

Сяляне і сялянкі! Ужо ззяюць праменні нашай перамогі. Больш хлеба Чырвонай Арміі! Сваёй актыўнай дапамогай фронту прыблізім радасны дзень нашай перамогі!

## ХЛЕБ—У ФОНД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

### Заклік перадавых людзей

Абмеркаваўшы абавязацельства калгаснікаў і аднаасобнікаў Беларусі аб здачы дадаткова ў фонд Чырвонай Арміі трох мільёнаў пудоў хлеба, сяляне в. Белавічы рашылі падтрымаць слаўны пачын сялян в. Вычэлкі Брэсцкага раёна і здаць злішкі хлеба ў фонд Чырвонай Арміі.

—Успомніце, таварышы,—сказаў на сходзе Іосіф Шыманчык,—як цяжка нам было ў час акупацыі. Чырвоная Армія вызваліла нас з рабскага ярма. У знак падзякі за наша вызваленне я дадаткова здаю ў фонд нашай вызваліцельніцы—Чырвонай Арміі 100 кг. хлеба. Заклікаю ўсіх сялян паследаваць майму прыкладу.

Услед за т. Шыманчыкам выступіў Валах Павел, які ўзяў абавязацельства здаць у фонд Чырвонай Арміі 130 кг. хлеба і другія.

Прыём хлеба арганізован на месцы. Чырвоным абозам у чэсць перамог нашых воінаў над ворагам ён будзе адпраўлен на ссыпны пункт.

**А. Каліна.**

### Здаюць хлеб у фонд Чырвонай Арміі

Сяляне Альбінскага сельсовета з радасцю здаюць хлеб у фонд Чырвонай Арміі. На ссыпны пункт пастуціла 1421 кг. добраякаснага збожжа.

Першымі пачалі здачу хлеба сяляне в. Куляшы. Бабей Георгій Матвеевіч здаў 500 кг. 65—гадовы Пропір Міхаіл, не гледзячы на тое, што яму была прадастаўлена льгота, дабравольна здаў у лік дзяржпаставак 250 кг. збожжа. Зараз ён здаў 150 кг. хлеба ў фонд Чырвонай Арміі. 150 кг. хлеба здала ў фонд Чырвонай Арміі Кукса Ольга, муж якой змагаецца з ворагам на фронце. Такіх прыкладаў многа.

Сяляне Альбінскага сельсовета гараць жаданнем чым больш дапамагчы воінам Чырвонай Арміі ў хутчэйшым разгроме ворага.

Хлеб з сельсовета паступае кожны дзень.

Цярэшка, старшыня Альбінскага сельсовета.

* * *

2366 кг. хлеба здалі ў фонд Чырвонай Арміі сяляне в. Лазаўцы Бусяжскага сельсовета. У вёсцы ідзе дружны абмалот. Кожны стараецца чым хутчэй унесці свой уклад у агульную справу перамогі над ворагам.

### Рыхтуюць Чырвоныя абозы

Звыш 5 тон хлеба здалі у фонд Чырвонай Арміі сяляне в. Альшаніца. Следуючы прыкладу перадавікоў многія сяляне адказаліся ад прадстаўлен их ім льгот, выканалі дзяржаўныя хлебапастаўкі і зараз здаюць хлеб у фонд Чырвонай Арміі.

У вёсках Скураты і Квасавічы сяляне дружна абмалачваюць хлеб, каб Чырвоным абозам адправіць яго на ссыпны пункт.

## Палітычная работа сярод інтэлігенцыі

Вяліка роль совецкай інтэлігенцыі ў аднаўленні разрушанай ворагам народнай гаспадаркі і культуры.

Совецкі настаўнік, урач, работнік любой установы павінны не толькі добра ведаць сваю справу; яны павінны штодзённа павышаць свой палітычны ўзровень, цікавіцца ўсімі палітычнымі і гаспадарчымі пытаннямі, каб быць сапраўднымі будаўнікамі соцыялізма.

Нашы інтэлігенты павінны не толькі забяспечваць кіруючую ролю ў масах, але яны павінны вучыць масы і самі вучыцца ў масах. Нашы інтэлігенты павінны стаць кваліфіцыраванымі агітатарамі і прапагандыстамі. Да каго як ні да настаўніка, агранома, урача звернецца наш рабочы, наш селянін па любому палітычнаму і гаспадарчаму пытанню? І нашы інтэлігенты павінны даць вычарпальны і зразумелы адказ.

У мэтах практычнай дапамогі інтэлігенцыі раёна ў справе павышэння яе палітычнага ўзроўня аддзел прапаганды і агітацыі РК КП(б)Б будзе кожны месяц праводзіць лекцыі, даклады і гутаркі на розныя тэмы, прыцягваючы да гэтай справы кваліфіцыраваных лектараў і дакладчыкаў.

Акрамя гэтага інтэлігенцыя зможа папаўняць свае веды ў партгабінеце, гарадской бібліятэцы, на семінарах, кансультацыях і ў таварыскіх сабяседаваннях.

Вялікі Ленін заклікаў нас вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Гэты завет Уладзіміра Ільіча павінен памятаць кожны совецкі грамадзянін.

Т. Остраухава, заг аддзела прапаганды і агітацыі РК КП(б)Б

## Хто карыстаецца калодзежам хлебапякарні?

Пры косаўскай хлебапякарні маецца калодзеж. На першы погляд здаецца, што ён знаходзіцца ў узорным парадку. Але гэта толькі на першы погляд.

Уся бяда ў тым, што ля калодзежа няма пастаяннага вядра. А карыстаецца вадой не толькі пякарня, але і многа гаражан. Кожны ідзе сюды браць ваду з сваім вядром, што з санітарнага пункту погляду з'яўляецца недапусцімым.

Акрамя гэтага праезжыя людзі пояць з гэтага калодзежа коняй.

Цікава як на гэта глядзіць загхлебапякарні? Ці не не пара патрабаваць ад яго, каб калодзеж служыў для хлебапякарні, а не для пабочных людзей.

Алімаў.

## Чэхаславацкая брыгада — на заходнім фронце

ЛОНДАН, 23 кастрычніка. (ТАСС) Тут аб'яўлена, што ў саставе першай канадскай арміі знаходзіцца чэхаславацкая брыгада. Яна прайшла падрыхтоўку ў Англіі і ўпершыню выступіла на фронт.

## ЗАМАХ НА ГІМЛЕРА

ЛОНДАН, 23 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Дэйлі мейл» на прыбыўшага ў Будапешт гітлераўскага міністра ўнутраных спраў і камандуючага германскай «унутранай арміяй» Гімлера быў зроблен замах. Невядомай асобай у Гімлера было зроблена некалькі выстралаў. Гімлер ранен. Начальнік яго асабістай ахвоў забіт.

В. а. Рэдактара А. П. РУДОЙ.

# ПА РАЁНУ

## ГУКАВАЯ КІНОУСТАНОЎКА

У Косаўскім клубе ўстаноўлен гукавы кінаапарат. Ужо дадзена некалькі кіносеансаў. Працоўныя горада прагледзелі кінофільмы „Мядзведзь", „Комсамольцы" і рад кіножурналаў.

## ПАДПІСВАЮЦЦА НА ЛАТАРЭЮ

Актыўна праходзіць размяшчэнне білетаў 4-й грашова-рэчавай латарэі ў Грыўдзенскім сельсовеце. 234 падпісчыкі падпісаліся на суму у 6750 рублёў.

У в. Харошча ўсе падпісаўшыяся ўнеслі наяўнымі 2700 руб. Адстае в. Хадоркі.

В. Сідарэвіч.

## Комсамольска-маладзёжны сход

У Косаве адбыўся комсамольска-маладзёжны сход, прысвечаны пяцігадзіннаму выніку выканання клятвы дадзенай комсамольцамі і моладдзю ў пісьме т. Сталіну.

З дакладам выступіла настаўніца т. Карабеціян. Яна паказала вялікую роль комсамольцаў і моладзі нашага раёна ў барацьбе з нямецкімі акупантамі ў тылу ворага.

Комсамольцы і моладзь узялі абавязацельства яшчэ больш дапамагаць фронту, у чэсць 27-й гадавіны кастрычніка паслаць падарункі воінам Чырвонай Арміі.

## Лепшыя лесавозчыкі

Працуючы на вывазцы рудстойкі выдатных вынікаў дабіліся т.т. Бульскі Казімір і Адамчук Грыгорый (в. Руда Сенькевіцкага сельсовета). Яны штодзённа перавыконваюць нормы выпрацоўкі ў паўтара-два разы.

Усім возчыкам трэба браць прыклад з т.т. Бульскага і Адамчука.

В. Манахаў.

## АБ'ЯВА

Згублены ваенны білет, выданы косаўскім Райваенкаматам на імя грамадзяніна в. Мілейкі Альбінскага сельсовета Косаўскага раёна Касцюка Івана Сідаравіча, лічыць несапраўдным.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага, 100.